УДК 81376:811.161.3

**Шубадзёрава Ала Міхайлаўна**
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі “Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь”; кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНА АРЫЕНТАВАНАЙ ЛЕКСІЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

У артыкуле аналізуюцца метадалагічныя падыходы да фарміравання лексічных уменняў і навыкаў у працэсе фарміравання нрафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі. Аналізуюцца асноўныя наняцці, звязаныя з выкладаннем юрыдычнай лексікі, асаблівая ўвага надаецца ролі лексічнага кампанента ў маўленчай дзейнасці. Вызначаюцца абавязковыя элементы лексічнай кампетэнцыі, апісваюцца этапы яе фарміравання. Падкрэсліваецца значэнне міждысцыплінарных сувязей у нрацэсе развіцця лексічных навыкаў.

Прафесійна арыентаванае навучанне лінгвістычным дысцыплінам, у тым ліку і беларускай мове (юрыдычнай лексіцы), адыгрывае важную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў праваахоўнай сістэмы. Прафесійная дзейнасць, аснову якой складаюць нарматыўна-прававыя дакументы, юрыдычная тэрміналогія і афіцыйна-дзелавы стыль, патрабуе ведання спецыялізаванай лексікі, якая становіцца неабходнай умовай эфектыўнай працы. Навучальны працэс засваення такіх дысцыплін павінен быць накіраваны на развіццё навыкаў прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі, якая прадугледжвае дакладнае і адназначнае выражэнне думак не толькі ў пісьмовай форме (складанне пратаколаў, рапартаў, заключэнняў), але і вуснай камунікацыі (вядзенне допытаў, інструктажоў, публічных выступленняў і інш.), што змяншае колькасць прававых памылак і садзейнічае выкананню працэдурных норм. Лінгвадыдактычныя метады, якія дазваляюць змадэляваць рэальныя прафесійныя сітуацыі, фарміруюць у навучэнцаў здольнасць адаптаваць маўленне да розных умоў – ад фармальнага дакументазвароту да розных складаных камунікатыўных задач.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Фарміраванне прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі – актуальная задача навучання беларускай мове для спецыяльных мэт у ведамасных вышэйшых навучальных установах. Даследчыкамі неаднаразова адзначалася, што паспяховасць засваення моўных сродкаў, неабходных для вырашэння прафесійных задач, залежыць ад сістэмнага фарміравання ў навучэнцаў здольнасці аперыраваць спецыялізаванай тэрміналогіяй. Гэта палажэнне знаходзіць адлюстраванне ў навуковых і навукова-метадычных працах такіх вучоных як В. І. Жданько [1], Р. З. Байбурына [2], Ю. А. Баранцова [3] і інш.

Прафесійна арыентаваная лексічная кампетэнцыя – здольнасць выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў працэсе прафесійнай дзейнасці – з’яўляецца важным складнікам камунікатыўнай кампетэнцыі, якая выступае дзейсным сродкам падрыхтоўкі спецыялістаў розных профіляў, забяспечваючы іх гатоўнасць да эфектыўных зносін ў прафесійным асяроддзі.

У якасці лексічных адзінак звычайна выступаюць словы, устойлівыя спалучэнні слоў. Выбар лексічных адзінак і фарміраванне спецыялізаванага лексічнага пласта звычайна абумоўліваецца патрэбамі прафесійнай сферы (для праваахоўных органаў – юрыспрудэнцыі). Важнымі аспектамі лексічнай кампетэнцыі з’яўляюцца лексічныя веды, уменні і навыкі, якія выяўляюцца ў здольнасці навучэнцаў знаходзіць патрэбнае значэнне лексічнай адзінкі, выкарыстоўваць слова ў адпаведным кантэксце. Аднак, як адзначае В.Г. Старадубцава, азначэнне паняцця «лексічная кампетэнцыя» было б няпоўным, «калі б не ўключала ў свой склад моўны, маўленчы вопыт і асабістыя якасці навучэнцаў» [4, с. 128].

Аналіз навукова-метадычнай літаратуры паказаў, што ў структуры лексічнай кампетэнцыі часцей за ўсё вылучаюць наступныя элементы: матывацыйны, кагнітыўны і аперацыйны. Так, матывацыйны кампанент адказвае за ўсведамленне важнасці вывучэння тэрміналагічнага слоўніка для далейшага прымянення ў прафесійнай дзейнасці. Кагнітыўнае звяно ўключае веды і вопыт пазнавальнай актыўнасці, неабходныя для ажыццяўлення камунікатыўнай дзейнасці. Аперацыйны кампанент мае на ўвазе здольнасць правільна рэалізоўваць такія традыцыйныя віды маўленчай дзейнасці, як чытанне, пісьмо і гаварэнне.

Многія даследчыкі (В.І. Жданько [1], А.М. Шамаў [4]) у методыцы фарміравання прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі вылучаюць некалькі этапаў. В.І. Жданько лічыць, што развіццё лексічнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кампетэнцыі пачынаецца з тлумачэння новага прафесійна арыентаванага лексічнага матэрыялу для яго самастойнага засваення, другі этап – замацаванне і аўтаматызацыя лексічных уменняў і навыкаў, на трэцім этапе ўсе заданні накіраваны на выкарыстанне лексікі ў рэальнай камунікацыі, г.зн. набліжэнне маўленчай дзейнасці навучэнца да дзейнасці будучага спецыяліста.

Мэта першых двух этапаў – знаёмства з новымі юрыдычнымі тэрмінамі і іх лексічнымі значэннямі, адпрацоўка навыкаў выкарыстання тэрміналагічных адзінак у розных кантэкстах, а таксама замацаванне ў памяці новай прафесійнай лексікі і фарміраванне ўмення іх выкарыстоўваць у розных маўленчых сітуацыях.

Трэці этап фарміравання лексічнай кампетэнцыі асабліва важны і значны, бо садзейнічае развіццю камунікатыўнай граматнасці, якая забяспечвае паспяховае ўзаемадзеянне прадстаўнікоў праваахоўных органаў з рознымі сацыяльнымі групамі. Эфектыўная маўленчая практыка ўключае авалоданне стратэгіямі вербальнага рэгулявання канфліктаў, навыкамі інтэрпрэтацыі заканадаўства для непрафесійнай аўдыторыі і захаванне этычных норм у дыялогу з грамадзянамі. Пры гэтым прафесійная камунікацыя патрабуе не толькі ведання стандартызаваных фармулёвак, але і разумення рэгіянальных, культурных і сацыяльных асаблівасцей моўных паводзін, што актуальна ў полікультурных рэгіёнах. Такім чынам, курс беларускай мовы для будучых праваахоўнікаў павінен спалучаць лінгвістычную падрыхтоўку з элементамі псіхалінгвістыкі і сацыялінгвістыкі, фармуючы ў выпускнікоў комплексную здольнасць да дакладнага, этычнага і сацыяльна арыентаванага выкарыстання моўных рэсурсаў у прафесійнай дзейнасці.

На кожным этапе фарміравання лексічнай кампетэнцыі важную ролю адыгрывае тэкст, які з’яўляецца асноўнай адзінкай моўнага матэрыялу. Тэкст дае магчымасць не толькі асэнсоўваць прафесійныя словы і тэрміналагічныя спалучэнні, але і выступае метадалагічнай асновай для фарміравання ў навучэнцаў устойлівых навыкаў маўленчай дзейнасці.

Важнае значэнне мае папярэдні адбор розных тэкстаў па спецыяльнасці з улікам іх камунікатыўнай арыентаванасці, адбор і актывізацыя лексічных і граматычных адзінак, што стварае базу для трэніроўкі маўленчых уменняў і навыкаў. Традыцыйна прафесійна арыентаваны лексічны матэрыял адбіраецца згодна з наступнымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крытэрыямі: 1) адпаведнасць тэматыцы будучай спецыяльнасці; 2) частотнасць ужывання; 3) прагматычнасць ці магчымасць далейшага выкарыстання; 4) словаўтваральная каштоўнасць; 5) наяўнасць дадатковага значэння слова або словазлучэння, якое звязана з яго асноўным значэннем і можа выражаць эмацыйную, ацэначную, стылістычную або асацыятыўную афарбоўку.

У тэкстах моўны матэрыял паўстае ў яго натуральным функцыянаванні, адбываецца сінхроннае ўзаемадзеянне ўсіх узроўняў моўнай сістэмы; тэкст заўсёды адлюстроўвае пэўныя ментальныя характарыстыкі носьбітаў дадзенай мовы, што важна пры фарміраванні лексічнай кампетэнцыі навучэнцаў.

Такім чынам, для таго, каб навучэнцы дасягнулі высокага ўзроўню развіцця прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнтнасці, неабходна захоўваць паслядоўнасць этапаў яе фарміравання падчас адукацыйнага працэсу. Важна таксама выкарыстоўваць метады вывучэння лексічнага матэрыялу на аснове міжпрадметных сувязей з улікам асаблівасцей будучай спецыяльнасці, а таксама спецыфікі кагнітыўнай, маўленчай, псіхічнай і адукацыйнай дзейнасці навучэнцаў.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Жданько, О. И. Методика формирования профессионально ориентированной лексической компетенции обучающихся в техническом вузе : автореф. дис. … канд. нед. наук : 13.00.02 / О. И. Жданько ; Нижегородский гос. лингв. ун-т. – Нижний Новгород, 2016. – 25 с.
2. Байбурина, Р. З. Методика формирования профессионально ориентированной лексической компетенции у обучающихся юридического вуза / Р. З. Байбурина // Вестник Уфимского юридического института МВД России. – 2023. – № 2(100). – С. 137-143.
3. Воронцова, Ю. А. Особенности формирования лексической компетенции на основе профессионально ориентированного дидактического материала / Ю. А. Воронцова, Е. Ю. Хорошко // Вестник Калининградского филиала Санкт-Петербургского университета МВД России. – 2023. – № 1(71). – С. 105-110.
4. Стародубцева, О. Г. Лексическая компетенция как языковая основа профессионально-коммуникативной компетенции студентов неязыкового вуза / О. Г. Стародубцева // Бюллетень сибирской медицины. – 2013. – Т. 12, № 3. – С. 127-131.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова